# ГІСТОРЫЯ

УДК 930.(476)

***А.А. Савіч***

*канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*

## АЙЧЫННАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСІН НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1920–1930-х гг.

*У даследаванні адлюстраваны асноўныя навукова-метадалагічныя падыходы айчынных гісторыкаў да вывучэння і адлюстравання ў друку сацыяльна-эканамічнай гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. Аўтар раскрывае абумоўленасць акцэнтаў і фармулёвак гісторыі заходнебеларускай эканомікі ваенна-палітычнымі і палітыка-ідэалагічнымі прыярытэтамі савецкай улады. Апублікаваныя працы акцэнтавалі ўвагу на адмоўных рысах эканомікі Заходняй Беларусі, якія сталі наступствам польскага панавання і вызначаліся каланіяльным, аграрна-сыравінным характарам, занядбанасцю прамысловасці і аграрнай сферы, негатыўным для народных мас характары рэформаў. На падставе разнастайных крыніц, у першую чаргу архіўных матэрыялаў, ажыццяўляецца карэкціроўка і ўдакладненне адпаведных пазіцый, выяўлены паказчыкі, якія ва ўмовах буржуазна-капіталістычнай эканомікі, на падставе традыцыйнага гаспадарчага ўкладу, мясцовай сыравіннай базы і абмежаваных інвестыцый садзейнічалі пасляваеннаму аднаўленню і ўмацаванню гаспадаркі, забяспечылі эканамічную самадастатковасць Заходняй Беларусі.*

### Уводзіны

Ва ўмовах трансфармацыі сацыяльна-эканамічных адносін у нашай краіне, складанасцей спалучэння патрэб сацыяльна арыентаванай і рынкавай эканомік асаблівую актуальнасць і запатрабаванасць маюць аб’ектыўныя навуковыя веды аб стане прамысловасці і сельскай гаспадаркі, гандалю і сістэмы камунікацый, якія забяспечвалі рух тавараў са сферы вытворчасці ў сферу ўжытку. Значэнне гаспадаркі ў жыцці грамадства не абмяжоўваецца выключна эканамічнымі аспектамі. З сацыяльна-палітычнага пункту гледжання паспяховае вырашэнне задач эканамічнага развіцця было і застаецца эфектыўнай умовай сацыяльнай стабільнасці, інтэграцыі грамадства вакол агульных патрэб, сродкам пераадолення бар’ераў, у тым ліку этнаканфесійных, сацыякультурных, якія перашкаджаюць кансалідацыі насельніцтва на адпаведнай тэрыторыі. Таму прыцягваюць увагу і патрабуюць папулярызацыі станоўчыя бакі эканамічных адносін на тэрыторыі Заходняй Беларусі у 1920–1930-я гг., якія характарызаваліся ярка выражанай поліэтнічнасцю і поліканфесійнасцю, мелі свае гаспадарча-рэгіянальныя асаблівасці.

Мэта артыкула – выяўленне праз гістарыяграфічнае даследаванне навукова-тэарэтычных і крыніцазнаўчых магчымасцей далейшага прадметнага вывучэння тэмы для ажыццяўлення паўнавартаснай рэканструкцыі і адэкватнай інтэрпрэтацыі гісторыі эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі міжваеннага перыяду.

### Асноўныя падыходы айчыннай гістарыяграфіі да сацыяльна-эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі 1921–1939 гг.

Вядома, што сацыяльна-эканамічныя адносіны ў марксісцка-ленінскай метадалогіі гісторыі адносіліся да базісных паказчыкаў і былі асновай для разгортвання ўсіх астатніх – другарадна-надбудовачных аспектаў. Аднак пры тым, што адпаведныя накірункі гаспадарча-эканамічнага жыцця ў навуковых працах савецкіх аўтараў заўсёды папярэднічалі ў выглядзе прычын-перадумоў канкрэтных грамадска-палітычных і сацыякультурных працэсаў, здаралася, што базісныя аспекты жыцця не атрымлівалі грунтоўнага навуковага даследавання, а фігуравалі на старонках навуковых публікацый у выглядзе прызнаных штампаў і калек з партыйных адозваў і пастаноў. Гэта выяўляецца падчас гістарыяграфічнага асэнсавання сацыяльна-эканамічнай гісторыі Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. Айчынная гістарычная навука і сёння мае ўсталяваныя яшчэ ў 20–

30-я гг. ХХ ст. у якасці вызначальных тэзісы пра каланіяльны характар эканомікі Заходняй Беларусі, аграрна-сыравінны прыдатак, векавую адсталасць, наяўнасць феадальна-прыгонніцкіх праяў, ігнараванне імкнення заходнебеларускага насельніцтва да паляпшэння жыцця і праявы рацыянальна-прагрэсіўнага рэфармавання эканамічнай сістэмы польскай уладай, якія разам з памылкамі і здабыткамі савецкай эканамічнай мадэлі трэба ўлічваць сучасным эканамістам пры фарміраванні ўласнай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь [1, с. 17].

Гістарыяграфічная традыцыя адлюстравання сацыяльна-эканамічных адносін у Заходняй Беларусі ў айчыннай гістарычнай навуцы сфарміравалася яшчэ ў 1920–30-я гг., калі заходнебеларуская праблематыка мела включна важнае ваенна-палітычнае значэнне і карысталася вялікай цікавасцю з боку кіраўніцтва БССР. Пытанні сацыяльна-эканамічнага становішча беларускага народа ў складзе Польшчы ў 1920–1930-я гг. адносіліся да ліку прыярытэтных напрамкаў даследавання Заходняй Беларусі, якія былі сфармуляваны ў выніку ажыццяўлення партыйна-дзяржаўнай арганізацыі гістарычнай навукі ў БССР з відавочным агітацыйна-прапагандысцкім ухілам пры асвятленні заходнебеларускай праблематыкі [2, с. 37–38]. Аднадушна акцэнтуючы ўвагу на нацыянальным, сацыяльна-эканамічным уціску з боку польскіх уладаў, палітыка-прававым бяспраўі беларускага народа ў Польшчы, беларускія савецкія аўтары ў прапагандысцкім стылі намагаліся запэўніць у адсталасці, каланіяльным, аграрна-сыравінным характары эканомікі Заходняй Беларусі на фоне поспехаў сацыялістычнага будаўніцтва ў БССР, выкрываючы як быццам бы брутальную крывадушнасць і прагу пануючых колаў да ўзбагачэння за кошт эксплуатацыі народа, у тым ліку пры дапамозе рэформаў і фінансава-гандлёвых аперацый [3].

Пераважная большасць публікацый па сваёй стылістыцы больш падобныя да белетрыстыкі, чым да навуковых прац, што трэба тлумачыць недастатковым крыніцавым забеспячэннем. Красамоўным пацвярджэннем гэтага з’яўляецца вострая сутычка, якая суправаджалася «истерическими письмами» паміж Прадстаўніцтвам КПП пры Выканкаме Камінтэрна, з аднаго боку, і падпарадкаваным яму Прадстаўніцтвам КПЗБ пры КП(б)Б, з другога, з-за несвоечасовай перасылкі матэрыялаў [4]. Апошняе, як вядома, ажыццяўляючы практычную рэалізацыю планаў камінтэрнаўскага кіраўніцтва «на крэсах», арганізоўвала і кантралявала працэс вывучэння і асвятлення заходнебеларускай тэматыкі ў друку, падпарадкоўвала сабе вядомыя цэнтры вывучэння Заходняй Беларусі ў 20–30 гг. ХХ ст. [2, с. 29–30]. Што да матэрыялаў польскай статыстыкі, то іх трэба было неяк атрымліваць з Польшчы, а з гэтым былі цяжкасці, нават па дыпламатычных каналах. Вядома, што А. Загорнаў – дарадца савецкага пасольства ў Варшаве, які курыраваў беларускі рух у Польшы разам са знакамітым А. Ульянавым [5], – у сваім лісце ад 26 лютага 1926 г. у Прадстаўніцтва КПЗБ у Мінск скардзіўся на свайго кіраўніка – савецкага пасла П. Войкава, які прыдзіраўся да А. Загорнава за вялікі аб’ём дыпламатычнай пошты [6, арк. 20].

Аднак савецкія ўстановы, якія забяспечвалі ваенна-палітычныя пытанні ўзаемаадносін з Польшчай, усё ж мелі ў сваім распараджэнні матэрыялы польскай статыстыкі, на падставе якіх ажыццяўлялася адпаведнае планаванне. Несумненна, такія крыніцы паступова атрымлівала і Прадстаўніцтва КПЗБ, забяспечваючы імі падкантрольныя ёй навуковыя структуры, якія спецыялізаваліся на вывучэнні заходнебеларсукай тэматыкі, у першую чаргу Камісію па вывучэнні Заходняй Беларусі (КЗБ) пры Інбелкульце – БАН і Заходні сектар (ЗС) Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Гэтыя ўстановы былі напаўсакрэтнымі арганізацыямі, афіцыйны твар якіх павінен быў прыкрываць патаемную справу ажыццяўлення аналітычнай і арганізацыйна-прапагандысцкай справы па арганізацыі і падтрымцы рэвалюцыйнага руху на «крэсах». Разнастайная інфармацыя, атрыманая у тым ліку і разведвальным шляхам дзякуючы дзеянням заходнебеларускіх рэвалюцыянераў, у названых установах падвяргалася навукова-аналітычнай апрацоўцы

і трапляла ў распараджэнне ваенных спецыялістаў markdown рознага ўзроўню. Аб гэтым сведчаць адрывачныя звесткі пра навуковую працу КЗБ, якая была карысна ў першую чаргу Чырвонай Арміі і Дзяржпалітупраўленню, а вынікі даследаванняў былі як адкрытымі, так і толькі для службовага карыстання [7, с. 163–164; 8, арк. 125; 9, арк. 20].

Зразумела, што вынікі навуковага аналізу гаспадарча-эканамічнага жыцця Польшчы і Заходняй Беларусі не маглі быць апублікаваны ў адкрытым друку, бо грунтоўныя даследаванні пацвердзілі б ваенна-палітычную цікавасць савецкіх уладаў да Польшчы і насцярожылі б яе кіраўніцтва. І, наадварот, павярхоўны аналіз эканамічнага стану Заходняй Беларусі, адлюстраваны ў публікацыях 1920-х гг., калі ў СССР сур'ёзна разглядалі магчымасць ваеннага сутыкнення з Польшчай, павінен быў стварыць уражанне, у першую чаргу польскіх ваенных аналітыкаў, пра негатоўнасць савецкага боку да вайны на падставе адсутнасці ў іх грунтоўных ваенна-аналітычных даследаванняў эканоміка-стратэгічных магчымасцей будучага тэатру ваенных дзеянняў. Нядзіўна, што шматлікія публікацыі 1920-х гг. не адлюстроўвалі сапраўднага эканамічнага стану Заходняй Беларусі. У жаданні ўзмацніць адчуванне абумоўленасці жаданага рэвалюцыйнага паўстання цяжкім станам гаспадаркі і жыцця насельніцтва, памножаным на акупацыйна-дэструктыўную эканамічную палітыку правячых колаў Польшчы, савецкія аўтары захапляліся агучваннем адпаведных ідэалагічна выверавых лозунгаў [10].

Пры гэтым ужо ў сярэдзіне 1920-х гг. савецкія гісторыкі падрыхтавалі даследаванні для дзяржаўна-палітычных і ваенных савецкіх структураў і ўтрымлівалі інфармацыю для «ўнутранага карыстання», якая не агучвалася на старонках выданняў, была засакрэчанай, бо, акрамя іншага, разбурыла б штучна створаныя для ўкаранення патрэбных ідэалагемаў вобразы заходнебеларускай рэчаіснасці. Даследаванне стратэгічна важных пытанняў сацыяльна-эканамічнага становішча Заходняй Беларусі, а менавіта, прыроды і насельніцтва, стану прамысловасці, сельскай гаспадаркі, камунікацый, атрымалі грунтоўную навуковую распрацоўку. Гэта тлумачыцца тым, што такая інфармацыя мела асаблівую актуальнасць у сувязі з падрыхтоўкай СССР да ваеннага канфлікту з Польшчай. Прамое сведчанне гэтаму знаходзім, у прыватнасці, у грунтоўных шматстаронкавых статыстыка-эканамічных матэрыялах па Заходняй Беларусі, падрыхтаваных у 1928 г., дзе прама сказана: «У выпадку прыняцця аператыўнага рашэння, вышэйшае камандаванне павінна будзе ўлічыць сацыяльную абстаноўку ў раёне аперацый, улічыць яе станоўчыя і адмоўныя бакі як для нас, так і для праціўніка... Мэта нашай працы складаецца ў тым, каб служыць даведнікам для работніка Чырвонай Арміі» [11, арк. 7, 29].

Неапублікаваныя матэрыялы выклікаюць вялікую цікавасць: яны адлюстроўваюць высокі ўзровень распрацоўкі сацыяльна-эканамічнай гісторыі Заходняй Беларусі, праведзены з выкарыстаннем разнастайных дакументальных крыніц у выглядзе матэрыялаў польскай статыстыкі і даследаванняў, пастаноў, справаздач, пратаколаў, улётак, фінансавых і іншых дакументаў, у тым ліку тых, якія праходзілі па розных савецкіх дзяржаўных і партыйных інстанцыях.

Часткова гэтыя крыніцазнаўчыя напрацоўкі былі рэалізаваны ў публікацыях сацыяльна-эканамічнай гісторыі, якія пачалі публікавацца ў пачатку 1930-х гг. [12; 13]. Гэтыя даследаванні вызначаліся больш высокім навуковым узроўнем, мелі пад сабой трывалую крыніцавую базу, у тым ліку матэрыялы польскіх афіцыйных крыніц ў выглядзе перапісаў, звестак Галоўнага статыстычнага ўпраўлення, Прамыслова-гандлёвай палаты, статыстыкі прамысловасці, статыстыкі працы, статыстычных штогоднікаў, ваяводскіх дзённікаў, прамысловых і гандлёвых даведнікаў, справаздач інспекцыі працы і інш.

Але і ў 1930-я гг., нягледзячы на больш высокі ўзровень крыніцавага забеспячэння, айчынныя аўтары працягвалі асвятленне гаспадарча-эканамічнага жыцця ў традыцыйным духу. Як і раней, шырока выкарыстоўвалі разнастайныя спосабы для сцвярджэння негатыўных вобразаў эканамічнага жыцця «на крэсах». У прыватнасці, Я. Шней-

дэр, разважаючы аб аграрнай праблематыцы, красамоўна, але тэндэнцыйна разважаў аб нізкім узроўні таварнасці сельскай гаспадаркі Заходняй Беларусі: «Падатковы гнёт, кабала растаўшчыкоў, даўгі кулаку – усё гэта прымушае сялян адмаўляцца ад ежы, нават ад хлеба, і, выносячы апошняе на рынак, прадаваць. Калі селянін прыязджае на рынак, то і тут ён сустракаецца з перакупшчыкамі, памешчыцка-кулацкім кааператывам, якія за бясцэнак купляюць яго прадукты» [13, с. 18–20]. В. Фрышман, акцэнтуючы ўвагу на каланіяльным, аграрна-сыравінным стане эканомікі, у сваіх разважаннях згадваў «драпежніцкую высечку» лесу для паставак на экспарт, галоўную ролю Заходняй Беларусі ў пастаўках ільна і бульбы для Польшчы, канстатаваў заўважнасць у паслякрызісны час канцэнтрацыі вытворчасці амаль ва ўсіх галінах прамысловасці і стварэння манаполій па ініцыятыве ўраду, асабліва для арганізацыі сіндыката для замежнага гандлю. Акрамя гэтага існавала вялікая колькасць бюро прадаж, у т.л. «Мур» у Беластоку, «Цэнтрацэгла» ў Вільні, сіндыкат кафельнай вытворчасці ў Гродне. Некаторыя галіны вытворчасці (папяровая, шкляная, цэментная, гумавая) належылі агульнапольскім сіндыкатам «Цэнтрапапер», «Польгум» і інш. Акрамя таго, аўтар згадаў запалкавую, тытунёвую і спіртавую дзяржаўныя манаполіі. Разам з гэтым як характэрную рысу прамысловасці Заходняй Беларусі В. Фрышман адзначыў яе залежнасць ад знешніх рынкаў, калі некаторыя галіны працавалі выключна на экспарт (усе галіны лясной вытворчасці: дрэваапрацоўка, фанерная, лесанарыхтоўка), выявіў аб'ектыўныя перашкоды ў развіцці знешняга гандлю: значнае аддаленне ад портаў і «мёртвая» польска-літоўская мяжа. Называючы пакупную здольнасць мясцовага рынка ва ўмовах хранічнага беспрацоўя, аграрнага крызіса і растучай паўперызацыі як надзвычай нізкую, што не ведае сабе роўнай па ўсёй Еўропе, В. Фрышман падаў адпаведную статыстыку спажывання некаторых тавараў, у тым ліку пракату, керасіна, цэмента і солі. Гаворачы пра звужэнне ўнутранага рынку, «нажніцах цэн» і «гнёце манаполій і акупантаў», аўтар з негатыўнай гіпербалізацыяй адносна адпаведных паказчыкаў сцвярджаў аб адсутнасці ў некаторых месцах грашовага абароту, аб прымусе з боку ўраду браць падаткі натурай, нават не прадуктамі, а адпрацоўкай – шарваркамі, неабгрунтавана называючы іх адным з відаў прыгонніцтва [12, с. X, XVI–XX]. Як бачым, шырокая і шматаспектна прадстаўленая карціна гаспадарча-эканамічных адносін у Заходняй Беларусі была для таго часу дастаткова аб'ектыўнай. Аднак фактаграфія і аргументацыя аўтараў у дачыненні да пэўных эканамічных паказчыкаў выклікае ўсмешку, напрыклад, пры параўнанні рынкаў БССР і Заходняй Беларусі, бо пакупная здольнасць савецкага насельніцтва ва ўмовах будаўніцтва калгаснага ладу з цяжкасцю паддаецца дакладнаму навуковаму асэнсаванню.

Адмоўныя фармулёўкі і фрагментарнасць адлюстравання сацыяльна-эканамічнай, у тым ліку вытворча-прамысловай і фінансава-гандлёвай, праблематыкі ў айчынных публікацыях 1920–1930-х гг. можна патлумачыць тым, што ў той час, за выключэннем невялікага нэпаўскага перыяду, у савецкай краіне прыватнае прадпрымальніцтва, свабодны гандаль былі забаронены, а прадстаўнікі гэтага класу траплялі ў лік «лишенцев» і ўсялякім чынам падаваліся як сацыяльна варожыя элементы. Адначасова з гэтым у СССР разгортвалася хваля антысемітызму [14]. Пераносіць адпаведныя акцэнты і фармулёўкі на старонкі публікацый аб Заходняй Беларусі было вельмі рызыкоўна: рабочы клас Заходняй Беларусі – гегемон будучай рэвалюцыі – у большасці сваёй складаўся з прадстаўнікоў яўрэйскай нацыі, і для вялікай колькасці яўрэяў гандаль быў амаль што галоўным заняткам і адзіным сродкам часта далёка не заможнага існавання. Таму працей і больш надзейна было прадпрымальніцка-гандлёвыя адносіны і іх фактычную ролю ў гаспадарча-эканамічным жыцці Заходняй Беларусі, у тым ліку сярод яўрэйскага насельніцтва, замоўчваць.

Такім чынам, незапатрабаванасць аб'ектыўнай сацыяльна-эканамічнай гісторыі Заходняй Беларусі праяўлялася ў тагачасным гістарыяграфічным дыскурсе на фоне істотных, у першую крыніцазнаўчых, напрацовак 1920–1930-х гг. Нягледзячы на рэпрэсіі

савецкай улады ў дачыненні да беларускіх навукоўцаў і цэлых навуковых устаноў, іх навуковыя напрацоўкі, асабліва Заходняга сектара, і сабраныя калекцыі крыніц стварылі багаты і разнапланавы крыніцавы грунт для ўдасканалення навуковай карціны сацыяльна-эканамічнай гісторыі Заходняй Беларусі, так і нескарыстаны ў савецкі час. Да таго ж у выніку далучэння тэрыторыі Заходняй Беларусі да БССР велізарная колькасць польскіх дакументаў, як апублікаваных, так і архіўных, апынулася ў патэнцыяльным распараджэнні беларускіх гісторыкаў, якія з цягам часу сталі асновай для стварэння ўнікальных архіўных калекцый Дзяржаўнага архіва Брэсцкай, Гродзенскай абласцей, філіяла Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці ў г. Маладзечна.

Аднак стаўленне да гаспадарча-эканамічнай праблематыкі не змянілася карэнным чынам і на працягу другой паловы 1950–1980-х гг. Абумоўленыя ідэйна-палітычнай неабходнасцю і марксісцка-ленінскай традыцыяй стэрэатыпы сацыяльна-эканамічнага жыцця Заходняй Беларусі засталіся нязменнымі ў шматлікіх публікацыях па гісторыі заходнебеларускага рэвалюцыйнага руху [15].

Не праглядвалася імкненне да стварэння аб’ектыўнай, з глыбокім навуковым аналізам карціны сацыяльна-эканамічных адносін і ў профільных публікацыях. У прыватнасці, стан аграрнай сферы і прамысловасці ў агульных рысах, тэндэнцыйна, з вылучэннем негатыўных праяў быў адлюстраваны ў даследаваннях Б.Я. Кухарава, С.І. Наркевіч, А.А. Сарокіна [16]. Для асэнсавання агульнагістарыяграфічнага фону адзначым, што ў параўнанні з аналагічнымі публікацыямі 1920–1930-х гг. яны не змаглі выкарыстаць напрацаваную навукова-метадалагічную і крыніцазнаўчую базу для больш якаснай рэканструкцыі і пераканаўчай інтэрпрэтацыі сацыяльна-эканамічнай гісторыі Заходняй Беларусі. Як і працы папярэдніх гадоў, названыя даследаванні акцэнтавалі ўвагу на адсталасці Заходняй Беларусі, дэградацыі яе прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці ва ўмовах польскага «каланіяльнага панавання». Пры гэтым у стылі 1920–30-х гг. былі праігнараваны вызначальныя па сваёй сутнасці, характэрныя аспекты традыцыйнага для заходнебеларускага рэгіёна дробнарамесна-вытворчага ўкладу і дробнааптовага гандлю, якія ў большасці забяспечваліся яўрэйскімі рамеснікамі і гандлярамі.

З гэтага вынікае, што айчынная гістарыяграфія на працягу савецкага адрэзку часу не выконвала асноватворнай сацыяльнай функцыі – функцыі сацыяльнай памяці, звяртаючы ўвагу толькі на адмоўныя паказчыкі гаспадарскі, старанна замоўчваючы станоўчыя бакі, праявы і наступствы гаспадарчнага жыцця Заходняй Беларусі, якія маглі б быць выкарыстаны беларускай уладай у 1990–2000-я гг. пры распрацоўцы стратэгіі і тактыкі сацыяльна-эканамічнага жыцця Рэспублікі Беларусь.

Якасна новы перыяд развіцця беларускай гістарычнай навукі, у тым ліку заходнебеларускай гістарыяграфіі, пачаўся ў пачатку 1990-х гг. пасля распаду СССР і абвяшчэння незалежнасці Рэспублікі Беларусь [2, с. 155]. Канцэптуальныя падыходы беларускіх вучоных пачалі мяняцца ў неабходнасці разумення сутнасці і асаблівасцей гаспадарча-эканамічнага жыцця Заходняй Беларусі. Назіраецца імкненне больш аб’ектыўна адлюстроўваць характар і сутнасць мерапрыемстваў польскай улады. Так, у параўнанні з савецкім перыядам, калі аграрныя пераўтварэнні падаваліся з негатыўнымі ацэнкамі, у адзначаны час былі апублікаваны працы з больш узважанымі і абгрунтаванымі высновамі, якія акрамя недахопаў не выключалі і станоўчыя наступствы адпаведных мерапрыемстваў [17]. Характэрным для публікацый стала станоўчае ўспрыняцце каштоўнасцей прыватнай уласнасці і вольнай працы «на сябе», як, напыклад, у І. Кеза і У. Мароза: «Савецкія калгаснікі з заздрайсцю паглядвалі на суседні польскі бок, дзе бачылі знаёмага селяніна, які ўласным конікам араў уласную зямлю і не думаў пра тое, як пракарміць сям’ю» [18, с. 64]. Рост навуковай цікавасці да пытанняў развіцця дробнарамеснай, саматужнай прамысловасці, местачковых і вясковых рамёстваў і промыслаў, гандлёвых адносін, кааператыўнага руху рэалізаваўся ў выглядзе змястоўных да-

следаванняў і публікацый, якія ствараюць перадумовы для стварэння аб'ектыўнай, цэласнай карціны сацыяльна-эканамічнага жыцця Заходняй Беларусі 1920–1939 гг. [19].

Як паказвае прыведзены гістарыяграфічны агляд, беларуская гістарычная навука напрацавала пэўны навукова-тэарэтычны фундамент для далейшай паглыбленай навуковай распрацоўкі гісторыі заходнебеларускай эканомікі, які ў спалучэнні з адзначанымі вышэй крыніцавымі магчымасцямі ствараюць падставы для паўнавартаснага прадметнага навуковага даследавання розных галін эканомікі Заходняй Беларусі. У такім даследаванні лагічным і магчымым бачыцца шматбаковае асэнсаванне ўсіх найважнейшых аспектаў функцыянавання гаспадарча-эканамічных адносін. Сярод іх нарматыўна-прававыя асновы і канкрэтыка эканамічнай дзейнасці, функцыянавання аграрнага сектара, арганізацыі прамысловага і дробнарамеснага прадпрымальніцтва, гандлёвых і фінансавых адносін, выяўленне сістэмы і ўзроўняў эканамічнага супрацоўніцтва, ажыццяўлення разнастайных і align узроўневых гаспадарча-фінансавых аперацый з вызначэннем іх ролі, месца, спецыфікі і рэгіянальных асаблівасцей ў міжнароднай, агульнапольскай, рэгіянальнай гандлёвай структуры, дзяржаўна-эканамічнай і сацыяльна-палітычнай значнасці, эканамічнага і сацыякультурнага значэння гаспадарча-эканамічнай дзейнасці. Крыніцавай асновай такога вывучэння з'яўляецца польскае заканадаўства, распараджэнні, інструкцыі як вышэйшых польскіх дзяржаўных органаў, у тым ліку міністэрстваў (фінансаў, прамысловасці і гандлю, унутраных спраў), якія публікаваліся ў афіцыйным друку, так і гандлёва-прамысловай, гандлёва-рамеснай палат (ізбаў), ваяводскай, павятовай і гміннай адміністрацый, апублікаваных на старонках рэгіянальнага друку, у прыватнасці, у ваяводскіх дзённіках, ці захоўваюцца ў ваяводскіх, павятовых і гмінных фондах архіваў.

У гаспадарчай структуры Заходняй Беларусі заўважна праяўляюцца асобныя ўзроўні эканамічнай дзейнасці: міжнародны, агульнапольскі, ваяводскі, павятовы (горад) і гмінны (мястэчка, вёска), – гаспадарчыя суб'екты якіх ва ўмовах капіталістычнай арганізацыі гаспадаркі дзеля паспяховай канкурэнтнай барацьбы з рознай ступенню эфектыўнасці супрацоўнічалі, спалучаліся і арганізацыйна перапляталіся, абумоўліваючы адпаведныя эканамічныя паказчыкі і садзейнічаючы кансалідацыі на падставе ўзаемных гаспадарчых інтарэсаў. Асаблівую ўвагу прыцягвае гаспадарчае жыццё мястэчка і вёскі, інфармацыя аб якім найбольш чулліва ўспрымаецца грамадствам, якое пакінула пасля сябе значны масіў разнастайных крыніц, у першую чаргу архіўных, і адкрытае для навуковай распрацоўкі з выкарыстаннем методыкі вуснай гісторыі з магчымасцю рознаварыянтных верыфікацый. Пры гэтым неабходна звярнуць увагу на тое, што эканамічныя адносіны ў Заходняй Беларусі развіваліся кантынуітэтна, на падставе ўсталяваных яшчэ ў часы Расійскай імперыі традыцый гаспадарчага жыцця. Яны ў сутнасці сваёй, нягледзячы на вядомыя паўфеадальныя перажыткі, мелі выразныя вытворча-капіталістычныя рысы і не ўспрымаліся грамадствам і сродкамі масавай інфармацыі, акрамя выданняў левай арыентацыі, як сацыяльнае зло, адмоўна, а, наадварот, былі натуральнай, эканамічна абумоўленай формай гаспадарчай дзейнасці.

Гэта пацвярджаецца паглыбленым экскурсам у нарматыўна-прававыя аспекты гаспадарча-эканамічнага жыцця, адлюстраваных у «Dzienniku Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej», «Monitory Polskim», ваяводскіх «Dziennikach Urzędowych», у канкрэтыку функцыянавання прамысловых і дробнарамесніцкіх прадпрыемстваў [20], сельскагаспадарчай сферы, у тым ліку ажыццяўлення аграрных рэформаў, якія суправаджаліся фінансавай падтрымкай сялян з боку дзяржавы [21], гандлёвых адносін [22] і натуральных працоўных павіннасцей шарваркаў [23]. Пры гэтым неабходна падкрэсліць значную ролю ў ажыццяўленні гаспадарча-эканамічных працэсаў органаў мясцовага самакіравання, якія, шукаючы падтрымкі ў насельніцтва, абапіраючыся на яе, былі ініцыятарамі ўдасканалення гаспадарчага жыцця, забяспечвалі арганізацыйна-тэхнічныя ўмо-

вы і кантроль адпаведных пераўтварэнняў, фарміравалі мясцовы бюджэт, кантралявалі яго выкананне.

**Заключэнне**

Такім чынам, айчынная гістарыяграфія да апошняга часу дэманстравала выразна негатыўнае стаўленне да эканамічна-гаспадарчага жыцця Заходняй Беларусі, ігнаруючы аб’ектыўныя прычыны эканамічных цяжкасцей, мэтанакіравана замоўчваючы поспехі і не зважаючы на станоўчыя бакі, пазбаўляючы заходнебеларускае насельніцтва правасуб’ектнасці ў эканамічных адносінах, ставячы яго ў пасіўны стан залежнасці ад «пана» і «гандляра». Сацыяльна-эканамічная тэматыка была сродкам ідэйна-палітычнага змагання, гэтак сама як і пытанні грамадска-палітычнага становішча і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі, асвятленне якіх мела ярка выражаны агітацыйна-прапагандысцкі характар. Так, нягледзячы на рынкавую збалансаванасць і высокую ступень эканамічнай самаарганізацыі і сыравінна-энергетычнай самадастатковасці гаспадаркі Заходняй Беларусі з вядомымі складанасцямі і крызісна-дэпрэсіўнымі праявамі, паступова гістарыяграфічна ствараўся вобраз беларускага народа, які пакутуе пад «непасільным ярмом польскіх паноў» у той час, калі людзі ў БССР жывуць нашмат лепш, чым іх адзінакроўныя браты ў Заходняй Беларусі.

Негатыўныя фармулёўкі былі абумоўлены эканамічнымі і ідэйна-класавымі прыярытэтамі савецкай гістарыяграфіі, якая ва ўмовах тагачаснага грамадска-палітычнага рэжыму зыходзіла з думкі аб безумоўнай каштоўнасці і вартасці савецкай сацыялістычнай мадэлі гаспадаркі. Але і сёння многія з папярэдніх сцвярджэнняў працягваюць успрымаца як праўдзівая інфармацыя, нягледзячы на грунтоўныя напрацоўкі айчынных і асабліва польскіх аўтараў і велізарны масіў архіўных матэрыялаў, якія больш адэкватна прэзентуюць сацыяльна-эканамічнае жыццё Заходняй Беларусі.

Знаёмства з архіўнымі матэрыяламі запэўнівае ў магчымасці стварэння працы па гісторыі гаспадарча-эканамічнага жыцця ў Заходняй Беларусі як больш эканамічна значнай, разнастайнай і ўнікальнай з’явы ў айчыннай гісторыі ў параўнанні з тым, як гэта падавалася савецкай гістарычнай навукай. Асабліва трэба адзначыць відавочную правасуб’ектнасць заходнебеларускага насельніцтва як сукупнасці ўдзельнікаў эканамічных працэсаў, іх актыўны і свядомы ўдзел у эканамічным жыцці з разлікам на свае сродкі і рэсурсы, без ілюзій і спадзяванняў на падтрымку «сацыяльна арыентаванай дзяржавы».

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Экономическая мысль Западной Беларуси в 1921–1939 гг. / В. Н. Бусько, Б. С. Войтешенко, С. Н. Якимченко ; под нач. ред. П. Г. Никитенко. – Минск : Право и экономика, 2004. – 158 с.

2. Савіч, А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2012. – 288 с.

3. Боген, Д. Заходняя Беларусь пад крывавым бізуном польскіх акупантаў / Д. Боген. – Мінск : Белдзяржвыдавецтва, 1931. – 15 с.; Гарбацэвіч, П. Палёнізацыя Заходняй Беларусі / П. Гарбацэвіч. – Мінск, Беларус. акад. навук, камісія Заход. Беларусі, 1932. – 34 с.; Гак, Л. Аграрная палітыка польскай буржуазіі ў Заходняй Беларусі / Л. Гак. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі. Партмассектар, 1933. – 95 с.; Пад польскім ярмом. – Мінск : Беларус. дзярж. выд-ва, 1929. – 23 с.; Шабсин, И. Как живут в Польше украинские и белорусские крестьяне / И. Шабсин. – М. : Изд-во ЦК МОПР, 1926. – 15 с.; Шнейдэр, Я. Абнішчанне сялянства на Заходняй Беларусі і шлях да заможнага жыцця

ў БССР / Я. Шнейдэр. – Мінск : Выд-ва Беларус. акад. навук, 1934. – 53 с.; Шнейдэр, Я. Становішча сялянства Заходняй Беларусі / Я. Шнейдэр. – 2-е выд., дап. – Мінск : Выд-ва Беларус. акад. навук, 1935. – 53 с.; Лучанін, М. Заходняя Беларусь пад панаваньнем Польшчы / М. Лучанін. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. – 56 с.; Заходняя Беларусь : зборнік. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925. – 68 с.; Западная Белоруссия : сб. статей. – Минск : Белорус. гос. изд-во, 1927. – Кн. 1. – 211 с.; Вансоўскі, Б. Куды вядзе Пілсудзкі Польшчу. Палітыка-эканамічны нарыс сучаснай Польшчы. – Мінск : Белдзяржвыд, 1927. – 100 с.

4. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 80.

5. Илькевич, Н. Н. Александр Ульянов и версия НКВД об антисоветском подполье в БССР (фальсификация органами НКВД уголовных дел в 1937–1938 гг.) / Н. Н. Илькевич, Р. П. Платонов. – Минск : БелНИИДАД, 1997. – 100 с.

6. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 86.

7. Астрога, В. А. «Шпіёнскае гняздо»: Стварэньне і дзейнасьць Камісіі па вывучэньні Заходняе Беларусі / В. Астрога // Спадчына. – 1996. – № 6. – С. 156–167.

8. НАРБ. – Ф. 4п. Воп. 1. Спр. Д. 6107.

9. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі. – Ф. 68. Воп. 1. Спр. 3.

10. Лучанін, М. Заходняя Беларусь пад панаваньнем Польшчы / М. Лучанін. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1926. – 56 с.; Заходняя Беларусь : зборнік. – Мінск : Дзярж. выд-ва Беларусі, 1925. – 68 с.; Западная Белоруссия : сб. ст. – Мінск : Белорус. гос. изд-во, 1927. – Кн. 1. – 211 с.; Вансоўскі, Б. Куды вядзе Пілсудзкі Польшчу. Палітыка-эканамічны нарыс сучаснай Польшчы. – Мінск : Белдзяржвыд, 1927. – 100 с.

11. НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 7.

12. Фришман, В. Промышленность Западной Белоруссии. Статистико-экономическое описание / В. Фришман. – Минск : Изд-во Белорус. акад. наук, 1934. – 133 с.

13. Шнейдер, Я. Очерк размещения промышленности Западной Белоруссии / Я. Шнейдер. – Минск : Изд-во акад. наук, 1936. – 104 с.

14. Нэп и экономическое положение евреев в 1920-е гг. [Электронный ресурс] // Электронная еврейская библиотека. – Режим доступа: file://localhost/C:/Documents%20and%20Settings/ Admin/Рабочий%20стол/Сов% 20 Союз % 20 Евреи % 20в % 20 Советском % 20 Союзе % 20в % 201922–41%20гг..%20Электронная%20еврейская%20энциклопедия.mht. – Дата доступа: 20.09.2015.

15. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / А. Н. Мацко [и др.] ; под ред. А. Н. Мацко и В. Е. Самутина. – Минск : Беларусь, 1966. – С. 19; Мацко, А. Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков (1918–1939 гг.) / А. Н. Мацко. – Минск : Беларусь, 1972. – С. 41; Полуян, В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / В. А. Полуян. – Минск : Наука и техника, 1978. – С. 21.

16. Кухарев, Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / Б. Е. Кухарев ; под науч. ред. проф. И. Н. Шемякина. – Минск : Выш. шк., 1975. – 112 с.; Наркевич, С. И. Промышленность Западной Белоруссии в период белопольской оккупации (1920–1939 гг.) : автореф. дис. … канд. экон. наук / С. И. Наркевич. – Минск, 1965. – 20 с.; Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 201 с.; Сорокин, А. А. Революционное и освободительное крестьянское движение в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск : БГУ, 1970. – 171 с.

17. Зялінскі, П. І. Аграрная рэформа ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / П. І. Зялінскі // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: Гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 17–18 верас. 1999 г. / адк. рэд.: П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў. – Мінск : БДУ, 2000. – С. 24–30; Коўкель, І. І. Эканамічнае ста-

навішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1921–1939 гг.) / І. І. Коўкель // Праблемы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук.-тэарэт. канф., Мінск, 17–18 верас. 1999 г. / адк. рэд.: П. І. Брыгадзін, У. Ф. Ладысеў. – Мінск : БДУ, 2000. – С. 16–24; Грэсь, С. М. Аграрныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. : манаграфія / С. М. Грэсь ; М-ва аховы здароўя Рэсп. Беларусь ; Гродз. дзярж. мед. ун-т. – Гродна : ГрДМУ, 2012. – 202 с.; Гарматны, В. Правядзенне камасацыі ў Палескім ваяводстве ІІ Рэчы Паспалітай (1921–1939 гг.) / В. Гарматны // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2008. – № 30. – С. 162–171; Гарматны, В. Правядзенне камасацыі на тэрыторыі Віленскага ваяводства ў 1921–1939 гг. / В. Гарматны // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2015. – № 43. – С. 135–157.

18. Кез, И. В. Сквозь годы и грозы ХХ века / И. Кез, В. Мороз. – Брест : Альтернатива, 2014. – 384 с.

19. Шепетюк, В. В. Участие еврейского населения в формировании и функционировании торговых отношений на территории Полесского воеводства / В. В. Шепетюк // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёна Беларусі : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Брэст, 23–24 крас. 1998 г. : у 2 ч. – Брэст, 1998. – Ч. 2. – С. 162–168; Вайцешчык, Г. С. Мястэчкі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / Г. С. Вайцешчык ; БДПУ імя М. Танка. – Мінск, 2013. – 23 с.; Лаўрэенка, Л. В. Развіццё рамяства і рамеснай вытворчасці на заходнебеларускіх землях у 1921–1939 гг. / Л. В. Лаўрэенка // Вестн. Полоц. гос. ун-та. – 2013. – № 1. – С. 77–82; Лаўрэенка, Л. В. Стан лясной прамысловасці Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. / Л. В. Лаўрэенка // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 2, Гісторыя. Эканоміка. Права. – 2013. – № 1. – С. 77–85; Радзюк, А. Л. Беларускія кааператывы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. Л. Радзюк. – Мінск, 2014. – 20 с.

20. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 3979, Спр. 1606, Спр. 1618, Спр. 4105; ДАБВ. – Ф. 26. Воп. 1. Спр. 37; Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 551. Воп. 1. Спр. 2235, Спр. 2230, Спр. 2250, Спр. 709, Спр. 745.

21. ДАБВ. – Ф. 28. Воп. 1. Спр. 74; ДАБВ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 5934. Ч. 1, Спр. 6069, Спр. 6070; ДАГВ. – Ф. 57. Воп. 1. Спр. 173, Спр. 169; ДАГВ. – Ф. 103. Воп. 1. Спр. 1.

22. ДАБВ. – Ф. 2001. Воп. 1. Спр. 1619, Спр. 4183.

23. ДАБВ. – Ф. 26. Воп. 1. Спр. 37; ДАБВ. – Ф. 28. Воп. 1. Спр. 62, Спр. 45; ДАГВ. – Ф. 103. Воп. 1. Спр. 9; ДАГВ. – Ф. 57. Воп. 1. Спр. 210, Спр. 214, Спр. 188.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 23.06.2016

***Savich A.A.*** **Domestic Historiography of Socio-Economic Relations in the West of Belarus of 1920s–1930s**

*The study reflects the main scientific and methodological approaches to the study of local historians and reflection in the printing of social and economic history of Western Belarus in 1921–1939 years. The author reveals the conditionality of accents and language of the history of Western Belarus economy of the military-political and political-ideological priorities of the Soviet regime. Published works have focused on the negative features of the economy of Western Belarus, which were the result of Polish rule and determined colonial, agrarian and raw character, neglect of industrial and agricultural spheres, negative for the masses character of reforms. Based on a variety of sources, primarily archival materials, the correction and clarification of the respective positions is carried out, the indicatorsare identified that in the conditions of bourgeois-capitalist economy based on traditional economic structure, the local resource base and limited investment contributed to the post-war reconstruction and the strengthening of the economy, ensured economic self-sufficiency of Western Belarus.*